Аляксей
Бураўкін

кандыдат тэхнічных навук, дацэнт,
начальнік цэнтра інфармацыйных тэхналогій
Акадэміі паслядыпломнай адукацыі
(г. Мінск, Беларусь)

# Нацыянальная культура як сістэма інтэграцыі гуманітарных і дакладных ведаў

Відавочныя адзнакі, што выяўляюць станаўленне інфармацыйнага грамадства, — амаль неабмежаванае распаўсюджанне інфармацыйных тэхналогій, ужыванне новых форм камунікацый, узнікненне новых відаў вытворчай і творчай дзейнасці (на аснове такіх тэхналогій) — адлюстроўваюць імклівы працэс узаемадзеяння гуманітарных і дакладных ведаў [1]. Дакладныя веды пры гэтым даюць у першую чаргу інструментарый стварэння новых форм існавання аб'ектаў гуманітарнага характару і метадаў вырашэння традыцыйна гуманітарных праблем [2]. Гуманітарныя веды ў гэтым глабальным узаемадзеянні фарміруюць прастору задач удасканалення і развіцця.



Узаемадзеянне паміж гуманітарнымі і дакладнымі навукамі не з'яўляецца чымсьці новым, але на сучасным этапе яно набыло інтэнсіўны характар. У гуманітарных навуках даволі трывала праяўляецца тэндэнцыя «матэматызацыі» [3]. Асноўныя паняцці «мадэль», «шаблон» і г. д. выкарыстоўваюцца на працягу ўсяго тэксту ў якасці ключавых.

Навукова-вытворчым увасабленнем названага ўзаемадзеяння ёсць інфарматызацыя культуры. Функцыя захавання і перадачы ў прасторы і часе культурных здабыткаў падтрымліваецца ўкараненнем адмысловага тэхналагічнага працэсу — рэтраспектыўнай канверсіі інфармацыйных рэсурсаў [4]. Менавіта на аснове рэтраканверсіі адбываецца рух культуры ў глабальнай інфармацыйнай прасторы.

Тэарэтычнай асновай адлюстравання і пабудовы механізма ўзаемадзеяння гуманітарных і дакладных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведаў з’яўляецца агульная тэорыя сістэм [5]. Пры гэтым базавым інструментам ажыццяўлення агульных структурных і функцыянальных рашэнняў выступае мова [6]. Яна ўвасабляе сродкі:

- мадэлявання (адлюстравання);
- кіравання (узгаднення);
- стварэння новых ведаў.

Мова — універсальны сродак сістэмнага адлюстравання свету, мадэль. Яна складаецца з класіфікацыйных элементаў і падсістэм, якія адлюстроўваюць існыя структуры (матэрыяльныя і нематэрыяльныя) навакольнага свету. Мова ўтрымлівае (або дае апісанне) веды народа, які яе ўжывае. У тым ліку мова ўтрымлівае матэматыку, з’яўляецца сродкам сістэмнай фармалізацыі і арганізацыі ўсіх відаў чалавечай дзейнасці, характэрных для яе (мовы) нацыянальнай супольнасці.

Мова ёсць таксама сродак кіравання. Рэгуляванне дачыненняў у кібернетычных сістэмах ажыццяўляецца моўнымі сродкамі. Мова ўтрымлівае канструкцыі, якія ўвасабляюць алгарытмы дзеянняў у праблемных сітуацыях, уласцівых арэалу існавання (адлюстраванне складу экалогіі), структуры соцыуму (і яго змен), стану і ўзаемадачыненню светаглядаў (ментальныя, рэлігійныя, маральныя, эстэтычныя складнікі), што ўплываюць на тэхналогію прыняцця рашэнняў.



Мова — сродак стварэння новых ведаў. Акрамя «ўласнай» творчай сферы (літаратура) мова як сістэма мае свае спосабы («тэхнікі») увядзення наватвораў і ўсталявання ўнутрымоўных сувязей для створаных ведаў і паняццяў.

Акрамя таго мова ўвасабляе механізмы перадачы, захавання ведаў, а таксама абароны (інфармацыйнай бяспекі і цэласнасці).

Мова з’яўляецца важнейшым складнікам нацыянальнай культуры.

Гуманітарныя і дакладныя веды таксама ўключаны ў сістэму нацыянальнай культуры. Інтэграцыя гуманітарнай і дакладнай частак адзінай навукі — гэта ўзгодненыя дзеянні ў працэсе творчасці новых ведаў (мал. 1).

Кожная сістэма нацыянальнай культуры мае ўласную канфігурацыю (структуру), якая вылучае яе сярод іншых. У гэтым сэнсе больш інтэнсіўная інтэграцыя дакладнай і гуманітарнай частак спрыяе захаванню цэласнасці, акрэсленасці нематэрыяльнай структуры, а, значыць, павышае мабільнасць і здольнасці адаптацыі ў зменлівым свеце.

Для нацыянальнай культуры адносна невялікага народа, напрыклад, беларускага (у адрозненні ад рускага, французскага, нямецкага),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глабалізацыя і найбольш яскравая яе праява інфарматызацыя маюць супярэчлівыя ўплывы:

- магчымасць больш шырокага і непасрэднага прадстаўлення ў глабальных інфармацыйных структурах, што забяспечвае хуткі доступ да дакладнай інфармацыі як з боку носьбітаў нацыянальнай культуры, так і з боку прадстаўнікоў культур іншых народаў;
- «выцясненне», «паглынанне» інфармацыйных рэсурсаў невялікай нацыянальнай культуры рэсурсамі культуры вялікага народа за кошт значнай колькаснай перавагі і фінансавай падтрымкі.

Асабліва выразна гэтыя тэндэнцыі праяўляюцца ў сферах культуры і мастацтва, блізкіх да рынку (агрэсіўнае канкурэнтнае асяроддзе), арыентаваных на масавае спажыванне.




Мал. 1



У сувязі з гэтым стратэгія актывізацыі інтэграцыі гуманітарных і дакладных ведаў у межах сістэмы нацыянальнай культуры можа быць адной з прыярытэтных. Яе мэта — дасягненне высокай ступені адаптыўнасці і захавання цэласнасці ва ўмовах канкурэнтнага асяроддзя.

Да важнейшых пры ажыццяўленні названай стратэгіі адносяцца задачы:

- праектавання і стварэння разнастайных дзейных інтэграцыйных форм (камунікацыі прафесійных (у першую чаргу — навуковых) колаў, адукацыйныя праекты);
- стварэння, падтрымкі і множання інфармацыйных рэсурсаў нацыянальнай культуры па асноўных напрамках;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• стварэнне новых рэсурсаў і прадуктаў (у першую чаргу — дынамічных сеткавых);

• пераводтрадыцыйных дакументаў у новыя формы — рэтраспектыўная канверсія.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Информационное общество : истоки, проблемы, тенденции развития / И. С. Мелюхин. — М. : Изд-во Моск. ун-та, 1999.

2. *Крюковский, Н. И.* Кибернетика и законы красоты : филос. очерк / Н. И. Крюковский. — Минск : Изд-во БГУ, 1977.

3. Культурология для культурологов : учеб. пособие для высш. шк. / А. Я. Флиер. — М. : Лит.-изд. агентство «Акад. проект», 2000.

4. Рэтраканверсія — тэхналогія захавання культурнай спадчыны ў інфармацыйным грамадстве / А. Г. Бураўкін // Программа ЮНЕСКО «Память мира» : деятельность библиотек, архивов, музеев по сохранению документального наследия : материалы Междунар. конф. — М., 1992.

5. Общая теория систем : сб. ст. / пер. с англ. В. Я. Алтаева и Э. Л. Наппельбаума. — М. : Мир, 1966.

6. Мастацкая культура як аб'ект інфармацыйнага мадэлявання : аўтарэф. дыс. ... на саіск. вучонай ступ. д-ра культуралогіі : 24.00.2001 / А. Г. Бураўкін ; Беларус. ун-т культуры. — Мінск, 2000.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ